

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

1993
ЛІПЕНЬ
7
СЕРАДА

№ 126 (561)

Цана
5 рублёў

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА



СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

ДВИЖЕНИЕ В ПОДДЕРЖКУ ШУШКЕВИЧА

ОБЪЕДИНЕННАЯ демократическая партия Беларуси и Белорусская крестьянская партия выступили с совместным заявлением ко всем гражданам Беларуси, партиям, движениям, общественным организациям с предложением о создании широкого демократического Движения в поддержку Председателя Верховного Совета Республики Беларусь Станислава Шушкевича.

Последние события в белорусском парламенте показали, отмечается в Заявлении, что Верховный Совет полностью исчерпал себя. Чтобы удержаться у власти, номенклатура пытается «выдать за причины своих неудач все, что угодно, кроме собственного бездействия». Как результат — непродуманные действия вроде требования присоединения к несуществующей системе коллективной безопасности. Этим же объясняются, считают авторы Заявления, попытки смещения Председателя Верховного Совета Республики Беларусь Станислава Шушкевича, который выступает за невхождение Беларуси в военные блоки и проведение широкой справедливой приватизации.

На взгляд авторов Заявления, среди принципов, на которых должно базироваться демократическое Движение в поддержку спикера, — досрочные выборы парламента и органов местной власти, невступление Беларуси в военные блоки, широкая приватизация в интересах народа.

В ГОСТЯХ У АМЕРИКАНСКОГО ПОСЛА

3 ИЮЛЯ Чрезвычайный и Полномочный Посол Соединенных Штатов Америки Дэвид Суорц устроил прием по случаю 217-й годовщины со дня провозглашения независимости США. Выступая перед гостями, господин Суорц рассказал о том пути, который прошла его страна к независимости и демократии. Он отметил, что хорошо понимает проблемы и трудности Беларуси, взявшей курс на суверенность, демократию и независимость, пожелал молодому государству успехов и процветания. Приглашенный на празднество оркестр Белорусского музыкального лицея завершил небольшую официальную часть исполнением национального гимна США.

Прием прошел в резиденции посла в Дроздах и, по словам Суорца, «впервые в чисто американском стиле»: на свежем воздухе в сосновом лесу под звуки музыки. Гостеприимный хозяин предоставил присутствующим возможность не только пообщаться друг с другом, отдохнуть, но и познакомиться с традиционной американской кухней.

Среди приглашенных находились Председатель Верховного Совета Республики Беларусь Станислав Шушкевич, министр иностранных дел Петр Кравченко, митрополит Минский и Слуцкий Филарет, патриарший Экзарх всея Беларуси, руководители парламентской оппозиции и демократических партий, иностранные дипломаты, журналисты.

АЭРАПОРТ «МІНСК-2»: ПРАЗ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ

АЭРАПОРТ «Мінск-2» днямі адзначыў «круглую дату» — дзесяць гадоў таму з бетонкі аэрапорта ўзняўся ў паветра першы ТУ-134 з пасажырамі на борце. Узлётна-пасадачная паласа, спартыўная зала «чакання» для пасажыраў — тое, што было тады. Зараз — аэравакзальны комплекс з наборам усіх відаў паслуг для авіяпасажыраў, тэхнічная аснашчанасць для забеспячэння ўзлёту і пасадкі па міжнародных нормах, набор збудаванняў для тэхнічнага персаналу.

Ужо ў 1991 годзе колькасць пасажыраў, якія скарысталіся з паслуг аэрапорта, мінула за 1 мільён, і ён стаў лічыцца адным з самых буйных на тэрыторыі былога Савецкага Саюза.

Зараз, аднак, галоўны аэрапорт Беларусі перажывае не лепшыя часы: скарацілася частата ўзлётаў і пасадак паветраных лайнераў. Але, нягледзячы на гэта, з кожным годам з'яўляецца ўсё большая колькасць рэйсаў у Еўропу. Самалёты з эмблемамі Германіі, Аўстрыі, Швейцарыі, Польшчы, ЗША — сталыя госці беларускіх авіятараў. Зыходзячы з урадавых пагадненняў, як стала вядома карэспандэнту БелаПАН з вартых даверу крыніц, у хуткім часе чакаецца адкрыццё новых паветраных ліній у краіны Азіі, Блізкага Усходу, Амерыкі.

НА ПАРАДКУ ДНЯ — МІНУЎШЧЫНА І БУДУЧЫНЯ

6 ЛІПЕНЯ ў Беларускім акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы пачалася III Усебеларуская палітычная канферэнцыя. Удзел у ёй прымаюць каля 100 дэлегатаў ад палітычных арганізацый Беларусі і замежжа і шматлікія госці.

Канферэнцыі належыць абмеркаваць і зацвердзіць праекты трох рэзалюцый — па пытаннях аб палітычнай ацэнцы рашэнняў II, Берлінскай, канферэнцыі, аб палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы, аб будучым дзяржаўным і канстытуцыйным ладзе Беларусі. Праекты распрацаваны аргкамітэтам канферэнцыі, у які ўваходзяць прадстаўнік БНФ, Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, Аб'яднанай дэмакратычнай і Нацыянальна-дэмакратычнай партый, Партыі народнай згоды і Жаночага хрысціянска-дэмакратычнага руху Беларусі.

АБАРАНІЦЬ ПРЫРОДУ ДАПАМОЖА... СЕМІНАР

7–9 ЛІПЕНЯ ў Мінску пройдзе вучэбны семінар «Падрыхтоўка спецыялістаў у галіне рацыянальнага выкарыстання і аховы навакольнага асяроддзя», сярод арганізатараў якога — прадстаўніцтва ААН у Беларусі і Савет Міністраў рэспублікі.

Работай семінара будуць кіраваць, па звестках БелаПАН, доктар А.Корнхаузер са Славеніі і прафесар з Будапешта пан Керакеш.

Удасканаленне нацыянальных экалагічных праграм, узаемаадносіны сучаснай эканомікі з навакольным асяроддзем — гэтыя і іншыя пытанні стануць прадметам абмеркавання і дыскусій, у якіх прымуць удзел прадстаўнікі розных рэгіёнаў Беларусі.

БГУ — ТОЛЬКО ДЛЯ БЕЛОРУСОВ

КАК СООБЩИЛИ корреспонденту РИДа в управлении высшей школы Министерства образования, в нынешнем году ВУЗы Беларуси принимают документы только от граждан нашей республики или белорусов, проживающих за рубежом. Иностранцы же как из дальнего, так и из ближнего зарубежья, смогут поступить в наши ВУЗы только на договорной основе с оплатой всего курса обучения. Впрочем, есть у абитуриентов и другой путь: учеба на паритетных началах, когда наши студенты поедут, к примеру, в Казахстан, а оттуда столько же прибудет в Минск.

Однако решить этот вопрос можно только после заключения специальных межправительственных соглашений. Пока проведены лишь предварительные переговоры и только с четырьмя республиками бывшего СССР — Россией, Молдовой, Казахстаном и Таджикистаном.

ПАДЗЕІ



БЕЛАРУСЫ СВЕТУ Ў МІНСКУ

Афіцыйна Першы з'езд беларусаў свету адбудзецца з 8 па 10 ліпеня, але ўжо амаль тыдзень Мінск прымае суайчыннікаў з Аўстраліі, Германіі, Польшчы, ЗША і іншых краін. І сумаваць ім не даводзіцца, бо гасцям і ўдзельнікам з'езда прапанавана цікавая культурная праграма — нехта ўжо пабываў на ўрачыстасцях у Нясвіжы, прысвечаных юбілейным гістарычным датам гэтага старажытнага горада; ці на ўрачыстасцях у Навагрудку, дзе адзначалася гадавіна каранавання князя Міндоўга; а ў ноч на Купалле — купальскія вогнішчы Высокага берагу (Стаўбцоўшчына) і Баўкалабаўскага (Быхаўшчына) аб'ядналі вакол сябе і гасцей, і гаспадароў.

Сёння передапошні дзень і ён таксама насычаны: адкрыццё мастацкай выставы «Жыве Беларусь!» у Палацы мастацтва, сустрэча з кіраўнікамі суполак у ЗБС «Бацькаўшчына», свята паэзіі «Палымянае слова Купалы» ў купалаўскім парку над Свіслаччу.

Сама праграма з'езда таксама даволі насычаная. Так, другі дзень работы будзе аддадзены пасяджэнням «круглых сталоў» па тэмах «Беларуская дзяржаўнасць», «Беларуская гаспадарка, прадпрымальніцтва», «Беларуская культура», «Беларуская дыяспара», а таксама сустрэчам у арганізацыях, установах і г.д.

У наступных нумарах «ДВ» чытайце новую інфармацыю аб Першым з'ездзе беларусаў свету.

А сёння мы прапануем гутарку з доктарам Янкам Запруднікам, вучоным, журналістам і літаратарам, які разам з іншымі амерыканскімі беларусамі знаходзіцца ў Мінску. Гутарку зрабіў Леанід ПРАНЧАК падчас паездкі ў ЗША.

ЯНКА ЗАПРУДНІК:
«БЕЛАРУС» — ГАЗЕТА БЕЛАРУСАЎ У ВОЛЬНЫМ СВЕЦЕ...»

Доктар Янка Запруднік — беларускі вучоны і даследчык са Злучаных Штатаў Амерыкі. Добра вядомы ён таксама як журналіст і літаратар. Доўгі час сп. Запруднік рэдагуе адно з самых старэйшых і прэстыжных беларускіх выданняў у Амерыцы — газету «Беларус».

— «Беларус» — газета беларусаў у вольным свеце. Дакладней кажучы, гэта орган беларуска-амерыканскага задзіночання. Але паколькі з газетай супрацоўнічаюць усе беларусы на Захадзе, на Бацькаўшчыне мы назвалі яе газетай беларусаў у вольным свеце. Ейны тэматычны дыяпазон вельмі шырокі. Хоць друкаванай плошчы мала — 8 старонак адзін раз у месяц — мы стараемся падаваць тое, што з тых ці іншых прычын не падае айчынны друк.

— Вы адчуваеце, што на Бацькаўшчыне вольнай прэсы ўсёткі няма?

— Тое, што мы чуем ад людзей Беларусі, сведчыць аб тым, што гэта так. Сам факт фінансавання друку ўрадам рэспублікі ці Вярхоўным Саветам гаворыць аб тым, што гэтыя газеты поўнай свабоды не маюць. Шмат у якіх выпадках, — той, хто дае грошы, — па-за крытыкай. А гэта абмяжоўвае свабоду. Газеты на Беларусі вельмі цікавыя. Тым не менш назваць іх незалежнымі пакуль нельга.

— Спадар Запруднік, цікава, а хто ж фінансуе вашу газету?

— На гэтае пытанне «Беларус» адказвае ў кожным сваім нумары. На восьмай старонцы мы друкуем справаздачы «На выдавецкі фонд «Беларуса». Там мы дакументуем кожны цэнт і падаём, хто колькі прыслаў. Сюды ўваходзіць кошт падпіскі і ахвяры. «Беларус» фінансуецца чытачамі, падпісчыкамі, прыхільнікамі беларускага слова, беларускай нацыянальнай ідэі.

— Калі параўноўваць «Беларус» сённяшні з яго аналагам даперабудовачным, то, на маю думку, ён стаў больш цікавым, а яго пазіцыя больш актыўнай...

— Можна так сказаць. Больш актыўная пазіцыя — гэта функцыя тае пабольшанай свабоды, што з'явілася на Беларусі. Актывізацыя па лініі мабілізацыі нацыянальнага элементу тлумачыцца тым, што ў апошні час пашырыліся кантакты з Бацькаўшчынай.

— Асноўнае прызначэнне «Беларуса» — пісаць летапіс беларускай эміграцыі...

— Так, ты правільна зазначыў. Але не толькі. Шмат месца мы адводзім падзеям на Бацькаўшчыне. Напрыклад, друкуем амаль усе матэрыялы БНФ. Год выдання «Беларуса» — 42. Калі пераглядаеш гадавікі, выдадзеныя за гэты час, то разумееш, што гэта летапіс. Тое, што калісьці было журналістычным матэрыялам, — сёння набывае вартасць дакументаў. Вось з такіх матэрыялаў, дзякуючы намаганням пісьменніка Уладзіміра Арлова, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйдзе зборнік «З гісторыяй на Вы». У яго ўвойдуць публікацыі 40-х, пачатку 50-х гадоў з газеты «Бацькаўшчына», часопіса «Запісы», альманаха «Конадні».

— А што тычыцца падзей на Бацькаўшчыне. Як вам бачыцца сітуацыя на Беларусі?

— Вельмі складаная, вельмі цяжкая. У палітычным сэнсе рэспубліка стаіць на раздарожжы перад вялікай праблемай: як асэнсаваць свой юрыдычны, палітычны, структурны фундамент, што закласці ў Канстытуцыю? Гэта ўсё вельмі складаныя пытанні. Энергія старога мыслення і ўлады яшчэ вельмі моцныя. Чым цяжэй эканамічна, тым большая пагроза палітычнай рэстаўрацыі. З гледзішча камуністаў чым горш, тым лепш. Кантраст паміж тым, што ёсць і што было якраз на карысць старому рэжыму. Нядаўна ў газеце я чытаў разважанні вясковага дзядзькі. Ён кажа: цяпер усюды мафія, злачынствы, крадзеж, а раней усё было спакойна. Тое, што раней рабілася вялікае злачынства ў дзяржаўным маштабе, ён ужо забыўся ці не ведаў аб ім нічога. А сёння пад уплывам штодзённых цяжкасцей старая кроў забываецца. І калі чалавек не падрыхтаваны і не мае запасу ведаў, каб параўнаць мінуўшчыну з цяперашчынай, дык ён абарачаецца да мінуўшчыны. Калі грамадства цёмнае, не асведамлёнае, дык у эканамічных цяжкасцях у цяперашчыне, што яно зробіць без уяўнага здзеку і гвалту? У гэтым вялікая пагроза дэмакратыі на Беларусі. Гэта вельмі трывожыць і нас, беларускіх эмігрантаў, і амерыканскі ўрад. У гэтым сэнсе прэзідэнт Клінтан добра разумее сваю місію. Ён гатовы дапамагаць Беларусі ў чарнобыльскай бядзе. У адным з нумароў «Беларуса» мы змясцілі яго выказванне, што дэмакратычныя працэсы ва Усходняй Еўропе вельмі кволыя. Патрэбна, казаў Прэзідэнт, замацоўваць іх эканамічнай і кансультатыўнай дапамогай. Мы гатовы дапамагаць сваёй Бацькаўшчыне. І ў меру сваіх сіл і магчымасцяў робім усё, каб дэмакратычны працэс на Беларусі развіваўся і стаў незваротным.

— І ў заключэнне нашай гутаркі, доктар Запруднік, колькі слоў аб тым, як робіцца газета «Беларус», хто працуе ў рэдакцыі?

— Слова рэдакцыя ў мяне асацыіруецца з нейкім памяшканнем. У нас яго няма. Рэдакцыя цяпер у мяне на стале. Дапісчыкі ў нас па ўсім свеце: і ў Парыжы, і ў Брусэлі, і ў Мельбурне... Адусюль прыходзяць карэспандэнцыі: адны напісаныя ад рукі, другія — на лацінскай машынцы, трэція — па-ангельску... Усё трэба адрэдагаваць, зрабіць макет, прачытаць карэкту, аддрукаваць... Усю гэту работу раблю я тым часам. Дапамагаюць мне Антон Шукелайць, Вітаўт і Зора Кіпелі, Адам Акуліч, які працуе ў беларускай рэдакцыі радыё «Свабода». Вялікую працу па рассылцы газет выконвае сп. Браніслаў Даніловіч. Вось так і робіцца газета «Беларус», якую зараз маюць магчымасць чытаць і беларусы на Бацькаўшчыне.

Гутарыў Леанід ПРАНЧАК.
Нью-Ёрк, лістапад, 1992 г.

КАЛЯНДАР

Серада, 7 ліпеня.

СОНЦА — 4.46/ 21.41.

Даўжыня дня — 16.55.

МЕСЯЦ — поўня 4 ліпеня, захад 8.00/ усход 22.34.

ІМЯНІНЫ

Сёння:


Праваслаўныя — Раждзаство Іаана Прадцечы (Хрысціцеля).

Каталіцкія — Бенедыкта, Судзіслава.

Заўтра:

Праваслаўныя — Пятра, Фяўроніі.

Каталіцкія — Альжбэты, Яўгена.



ВАЛЮТНОЕ ОБОЗРЕНИЕ

КУРС ДОЛЛАРА США (скупка–продажа)

ВИЛЬНЮС (за лит)

Литовский государственный коммерческий банк:
Доллар США — 3,85 — 4,35
За 100 рублей — 0,30 — 0,45

Коммерческие банки:
Доллар США — 3,90 — 4,20
За сто рублей — 0,30 — 0,45

Черный рынок:
Доллар США — 3.90 — 4,20
За сто рублей — 0,35 — 0.40

КИЕВ (за карбованец)

Коммерческие банки:
Доллар США — 3350 — 3980
Российский рубль — 2,40 — 4,28

Черный рынок:
Доллар США — 3400 — 3500
Российский рубль — 2,80 — 3,0

САНКТ-ПЕТЕРБУРГ

Коммерческие банки:
Доллар США — 1100 — 1150

Черный рынок:
Доллар США — 1100 — 1150

МИНСК

Комбанк «Комплекс»:
Доллар США — 1200 — 1250

Черный рынок:
Доллар США — 1200 — 1260

КРИМИНАЛ

Сергей РАЧИЛА, пресс-центр УВД г.Минска.

«МАЛЬЧИКОВ СЕГОДНЯ НЕ УНЯТЬ...»

—ГЛУПО ПИЩИТ гнусавый голосок на эстрадных подмостках, загребая несчастные родительские рублики. А в это время одурманенные «мальчики» отзываются предельной жестокостью...

На днях в Минске врачи «скорой помощи» привезли в больницу с переломом позвоночника и ушибами ног 21–летнюю минчанку С., находящуюся в отпуске по уходу за ребенком. Все происшедшее с ней поражает прежде всего своей дикостью и ... легкомыслием жертвы.

Накануне этой трагической развязки к молодой мамаше зашел ее 22–летний знакомый и пригласил в гости. Заметьте, в два часа ночи и в другой конец города! — что, впрочем, совершенно ее не смутило. Приняв это предложение, С. оказалась в пьяной компании хозяина квартиры и его 17–летнего друга–пэтэушника, которые после застолья вознамерились испытать свою сексуальную мощь на уже достаточно «подпитой» гостье.

Сумев каким–то образом усыпить далеко не благородный порыв самцов, женщина выскочила на балкон третьего этажа и попыталась спуститься на этаж ниже. Но руки не выдержали...

Выбежавшие на улицу подонки все–таки добились своего — прямо здесь же, у дома, воспользовавшись беспомощностью жертвы...

Все описанное происходило в один из последних выходных дней и, к сожалению, не явилось единичным фактом из разряда подобных. В это же время работникам столичной милиции стал известен еще один подобный случай. В течение двух последних месяцев три минских бездельника (возраст — 16–19 лет) систематически издевались над восьмиклассницей Анной М. на чердаке одного из домов. Все трое уже известны милиции.

БЫЛ ПЬЯН...

ТРАГЕДИЕЙ закончилась попытка 31–летнего минчанина М. достать с дерева улетевшего попугая. Находясь в нетрезвом состоянии, этот молодой человек сорвался с ветвей и от полученных травм по пути в больницу скончался...

НЕСВИЖУ — 770 ЛЕТ



Этот городок один из древнейших на Беларуси. Его многолетняя судьба связана с кланом князей Радзивиллов. При их владычестве здесь возведены Дворцово-парковый ансамбль, фарный костел, много других уникальных строений, которые нынче взяты под охрану государства и считаются памятниками старины далекой.


Не одна социальная буря проносилась над городом. Он не раз подвергался разорению во время войн. Многое сгорело, кануло в Лету в 1941-1944 годах. И все же Несвиж имеет свое лицо, свой неповторимый облик.

Особенно преобразился он в последние годы. На реставрацию его памятников, парковой зоны государство затратило десятки миллионов рублей. Под руководством главного архитектора проекта из Минска Н.Жлобы здесь по существу сделана целая революция. Положен дренаж, чтобы весной и осенью не «подтоплялись» деревья. Вместо старых елей, ольхи высажены молодые аллейки дуба, клена, ясеня. Проложены в парке дорожки из щебневой крошки (чтобы не нарушить микроклимат). Радуют глаз мосты и мостики с художественной оградой, скульптуры известных деятелей, которые в разное время здесь жили и творили. Кстати, установлено, что первый театр Беларуси «родился» в Несвиже. Здесь Сымон Будный напечатал в местной типографии свой «Катехизис».

...Общественность города широко отметила 770-летие Несвижа. На торжественном собрании в районном Доме культуры выступил председатель райисполкома В.Дрижин. Участие в празднике приняли заместитель Председателя Совета Министров Республики Беларусь М.Мясникович, министр информации А.Бутевич, народный поэт Беларуси Н.Гилевич.

Лучшим архитекторам и проектировщикам, которые трудились над возрождением Дворцово-парковой зоны, председатель Минского облисполкома А.Тишкевич вручил почетные грамоты Верховного Совета Республики Беларусь.

Разнообразной была культурная программа праздника. В гости к несвижанам приехали минские артисты театра им. Я.Купалы, Государственный академический хор имени Титовича, самодеятельные коллективы соседей-районов — Клецкого, Столбцовского, Барановичского, Ляховичского... Гудела, как улей, ярмарка, где можно было купить промышленные товары, продукты, сувениры.



Константин ПРИЯМКО. Фото Юрия ЗАХАРОВА.

Даждлівы дзень.

Фота Уладзіслава БАСЬКО.

Л.БУВАР:

«ДЛЯ ЕВРОПЫ ГЛАВНОЕ — БЕЗОПАСНОСТЬ»

— Посещение вашей страны дало нам уверенность в необратимости демократических перемен в Беларуси, — заявил корреспонденту БЕЛИНФОРМа президент Североатлантической ассамблеи Лаик Бувар, прибывший 29 июня вместе с генеральным секретарем этой организации П.Кортерьером с официальным визитом в Беларусь. — Ознакомление с ходом реформ и военной концепцией Беларуси и является целью нашей поездки.

О том, как бурлят в республике политические страсти, рассказал на встрече с руководителями САА, состоявшейся вечером 30 июня, Председатель Верховного Совета Станислав Шушкевич.

Глава Верховного Совета ознакомил Л.Бувара и П.Кортерьера с ходом преобразований в республике и выразил надежду, что уже в недалеком будущем Беларусь может стать больше, чем ассоциированным членом САА.

Такого же мнения придерживается и президент Североатлантической ассамблеи, заявивший, что очень доволен активной позицией Беларуси в деятельности САА. Он подчеркнул также свою уверенность в том, что демократические принципы, главенствующие в Европе, будут в полной мере реализованы в нашей суверенной республике. Для утверждающейся новой Европы, по мнению Л.Бувара, сегодня нет ничего важнее, нежели безопасность каждого гражданина, ее населяющего, в какой бы стране континента — западной или восточной — он ни жил.

Делегация САА посетила Министерство обороны Беларуси. Затем состоялась беседа в парламенте республики с депутатами, работающими в комиссиях по международным делам и внешнеэкономическим связям и по вопросам национальной безопасности, обороны и борьбы с преступностью. Побывали гости и в Прокуратуре Беларуси.

В заключительный день своего визита, 1 июля, руководители САА встретились с представителями Министерства иностранных дел республики. Во второй половине дня гости посетили мемориальный комплекс «Хатынь». По дороге в аэропорт они сделали остановку у кургана Славы и возложили там цветы. Потом гости вылетели в Цюрих.

БЕЛИНФОРМ.

ИНТЕРВЬЮ

КООПЕРАТОРАМ БЕЛАРУСИ –100

Международный день кооперации в 71-й раз отметили 3 июля работники этой отрасли. Накануне праздника корреспондент БЕЛИНФОРМа встретился с председателем Правления Белкоопсоюза республики Григорием Грищенковым и задал ему несколько вопросов.

— Григорий Захарович, поздравляю Вас с праздником!

— Спасибо. В этом году у нас действительно настоящий праздник. Ведь кроме Международного дня кооперации работники кооперативных организаций республики в эти дни отмечают и свой юбилей. 100 лет назад начало действовать первое на территории Беларуси потребительское общество. В архивах сохранилось письмо Министерства внутренних дел Российской империи на имя витебского губернатора, в котором сообщается об утверждении устава общества потребителей в Витебске в 1893 году. Так что у нас за плечами длинный исторический отрезок и большой опыт.

— И, конечно же, за сто лет первое общество потребителей превратилось в кооперативное движение.

— Да, потребительская кооперация Беларуси стала массовой общественно-хозяйственной организацией, выполняющей исключительно важную роль в жизнеобеспечении населения республики. Она обьединяет более 2,5 миллиона членов-пайщиков (четверть всего населения Беларуси), располагает разветвленной сетью предприятий торговли и общественного питания, заготовок и переработки сельскохозяйственных продуктов и сырья, подсобных хозяйств и промышленных обьектов. На сегодняшний день мы обеспечиваем 34 процента розничного товарооборота республики. В общем, можно приводить множество цифр и фактов, характеризующих вес и авторитет потребкооперации. Главное же — сегодня в республике не найдется ни одного жителя, который бы в той или иной мере не пользовался нашими услугами. А для сельского населения потребкооперация вообще стала неотъемлемой частью повседневной жизни.

— В день юбилея принято говорить только о хорошем. Но те экономические процессы, что проходят в республике, самым тесным образом коснулись Белкоопсоза. Какие проблемы решают сегодня белорусские кооператоры?

— Их очень много. Продолжается спад производства в промышленности и сельском хозяйстве. Безудержная инфляция резко взвинтила стоимость кредита. Как следствие — снизилась рентабельность торговли, каждое десятое предприятие и организация оказались в убытке. К тому же, в последнее время замедлилась оборачиваемость товаров, возросли товарные запасы, что, естественно, привело к увеличению расходов. Но самым злободневным вопросом является состояние расчетов. Сумма неплатежей на сегодняшний день составляет около 30 миллиардов рублей. Потому в музыке нашего праздника есть и грустные нотки.

— Осенью прошлого года Белкоопсоюз стал членом Международного кооперативного альянса. Поможет ли участие в столь солидной организации кооператорам республики в разрешении временных трудностей?

— Во-первых, надо отметить, что Белкоопсоюз активно сотрудничает с кооперативными организациями бывших союзных республик, является членом-учредителем Межкоопсоюза. В условиях разрыва экономических связей, возведения все новых пограничных барьеров это имеет очень большое значение для поддержания двусторонних отношений между многими традиционными партнерами новых независимых государств.

Что касается членства в Международном кооперативном союзе, то это поможет нам развивать экономическое сотрудничество с выгодными партнерами в странах дальнего зарубежья, явится мощным фактором моральной и правовой поддержки.

— Что ж, успехов Вам. И еще раз, с праздником!

Александр ЛЮШКЕВИЧ,
БЕЛИНФОРМ.

РЕСПУБЛИКА

Прощайте, мясо и молоко?

Как сообщил корреспонденту РИДа главный зоотехник молочного отдела Главка животноводства Министерства сельского хозяйства и продовольствия республики Станислав Молокович, поголовье скота за пять месяцев этого года уменьшилось по Беларуси на 428 тысяч голов.

ПО СРАВНЕНИЮ с прошлым годом поставки молочной продукции сократились на 14 процентов. Снижаются темпы производства и сейчас. Приостановить этот процесс удалось только в Брестской и Витебской областях.

Жулье шалит — народу морока

В очередях за продовольственными карточками нового образца выстаивают в эти дни честные граждане Полоцка.

Эту срочную меру отдел тоговли горисполкома принял всвязи с большим числом нарушений, выявленных в прежней системе распределения продуктов.

Политика национального «ограбления»

Бандитской назвал В.Базеко, директор Витебского чулочно-трикотажного комбината имени КИМ, политику Национального банка Республики Беларусь.

С начала года по постановлению правительства каждый второй заработанный предприятием российский рубль изымался у него Национальным банком и отоваривался «зайчиками» — один к одному. Затем предприятию запретили вообще иметь безналичные российские деньги. А с апреля Национальный банк начал продавать один российский рубль за два белорусских.

Теперь, чтобы приобрести сырье в России, предприятие вынуждено закупать у Национального банка свои же рубли по двойной цене. А потом этот двойной рубль закладывается в себестоимость продукции.

В Польшу — по Августовскому каналу

Гродно, увы, не входит в число экологически чистых городов республики, а потому немало средств в областном центре направляется в последнее время на природоохранные мероприятия. Так, недавно из внебюджетного фонда охраны природы решено выделить 260 миллионов рублей. Эти деньги будут использованы для строительства очистных сооружений в г.п.Ивье, создания рыбхоза «Докудовский» в Лидском районе и системы контроля за выбросами вредных веществ автотранспортом. Но самое главное, пожалуй, то, что 29 миллионов рублей из этой суммы будет направлено на проектирование и реконструкцию Августовского канала, протяженность которого составляет 18 километров и который уже более 50 лет как перестал функционировать в качестве водного пути между Польшей и Беларусью. Теперь же появилась реальная надежда на его возрождение.

Кошельки — не резиновые

В скором времени жигулевскую резину, произведенную на Бобруйском шинном комбинате, будут демонстрировать разве что в качестве музейных экспонатов. После введения на нее акцизного налога, как на товар повышенного спроса, стоимость одной автопокрышки достигла 50 тысяч рублей. Шокированные такой ценой покупатели-автолюбители подались на рынки за российской и украинской резиной. Она сейчас почти вдвое дешевле бобруйской.

«Сюрприз» для могилевских невест

Самые красивые девушки Могилевского театра моды продемонстрировали на праздничном балу лучшие образцы свадебных платьев.

Свадебные наряды были предоставлены польским модельером Урсулой Гапиньской из Влоцлавика. Говорят, что бал удался на славу и принес приглашенным немало приятных минут. Не меньше радости ожидает могилевских невест. Платья, стоимость каждого из которых составляет 200 тысяч рублей, будут выдаваться театром моды напрокат.

«Янтарное лето» Анжелики Гурской

Фестиваль-праздник эстрадной песни «Янтарное лето» проводится в городе Светлогорске (Калининградская область) не первый год. Однако артисты Лидского музыкального центра «Панорама» были приглашены на него впервые.

Кстати, Беларусь там представляли только лидчане.

На фестивале не присуждались места, но по реакции зала без преувеличения можно было сказать, что любимицей публики на этот раз стала солистка центра «Панорама» лидчанка Анжелика Гурская.

Брестские «пеўнікі»

В песенных праздниках в Киеве, Пскове, Санкт-Петербурге принимали участие эти славные мальчишки из образцового детского народного хора «Пеўнікі». Создан он при Брестском городском Доме культуры. В репертуаре коллектива как сложнейшие произведения композиторов-классиков, так и белорусские народные песни. «Пеўнікі» гастролировали и по многим городам соседней Польши.

Более 15 лет, со дня основания коллектива, руководит хором Олег Евгеньевич Нерода (на снимке), отдавая мальчишкам не только знания, но и теплоту души.

Фото Эдуарда КОБЯКА, БЕЛИНФОРМ.

Что делать, когда виноват

Трудно сказать, смогут ли получить свои деньги колхозы, пытающиеся через суд взыскать с Брестского мясокомбината убытки, понесенные по причине просрочки платежей. По существующему законодательству, комбинат обязан рассчитываться с поставщиками мяса в трехдневный срок. Но так как по решению облисполкома переработчики отправляли часть продукции не в местную торговлю, а в Узбекистан и Азербайджан, откуда по бартеру шел сахар, то деньги хозяйствам возвращались с большим опозданием.

Клюква рукотворная

Выработанные торфяники колхоза имени Чапаева Мостовского района станут местом для выращивания клюквы. После соответствующих подготовительных работ, выполненных местными мелиораторами, на площади в полтора гектара высажены черенки целебной ягоды. Вместе с технологией их предоставили земледельцы одного из хозяйств белорусского Полесья. Хотя обустройство первого чека обошлось колхозу примерно в 25 миллионов рублей, здесь рассчитывают на быструю окупаемость и намерены расширять плантации. А опыт соседей уже намерены использовать и в колхозе «Прогресс» того же района.

«Место распродажи иллюзий» — «Водоросли»

В Могилеве на базе рок-кафе «Заворот» действует концертная площадка «Водоросли». Площадка предназначена, в первую очередь, для выступлений молодых групп как белорусских, так и зарубежных.

Открыли счет выступлениям на сцене «Водорослей» две новые интересные могилевские группы — «Место распродажи иллюзий» и «Огни святого Эльма». На следующие концерты, которые состоятся 7 и 28 июля, ожидается приезд минской группы «Нейродюбель».

(По сообщениям РИД, БЕЛИНФОРМ.)

УДИВИТЕЛЬНОЕ — РЯДОМ

В КОНЦЕ ТОННЕЛЯ СВЕТИТ СОЛНЦЕ ВСЕМ

Как магнитом притягивают посетителей выставки «Церковь и культура», открытой в Национальном музее истории и культуры в дни празднования 200-летия Минской епархии, шесть выполненных в какой-то неизвестной доселе технике образов. Один из них — лик Ефросиньи Полоцкой явился автору — художнице Тамаре Богдановой — не то в полусне, не то в полуяви. А когда уже законченную работу сравнили со старинными фресками, оказалось, что именно такой изображали знаменитую у славянских народов святую.

— Я была обычным человеком, работала художницей по гриму в Белорусском театре музыкальной комедии, — рассказывает Тамара Владимировна, которая пришла на открытие выставки вместе с дочерью Сашенькой. — Но девять лет назад тяжело заболела и перенесла клиническую смерть. Все было так, как описывают в литературе: меня несло по длинному тоннелю к свету в конце его, по сторонам мелькали фигуры каких-то статуй, затем, как пушинку, меня поднесло к яркому лучу, и я очнулась. Еще в реанимации попросила нитки и крючок и в полубессознательном состоянии начала что-то плести. А когда очнулась окончательно, пришло понимание моего предназначения: я должна выполнить те лики, мимо которых проносилась по тоннелю. Я нигде не училась, не читала специальной литературы. Техника, которой я пользуюсь, — сочетание вышивки, аппликации, сетки. Причем лики были холодными до тех пор, пока не придала им объем, тоже с помощью вышивки... Все, что я создаю, является вначале мне так ясно, что остается только сделать эскиз. А иногда работаю и без него. Но всегда, прежде чем начать работу, пощу, исповедываюсь и получаю благословение священника. Я и до того была верующим человеком, а сейчас рассматриваю свою деятельность как благословение божье. На создание образа Ефросиньи Полоцкой получила благословение от самого митрополита Минского и Слуцкого Филарета, Патриаршего Экзарха всея Беларуси. Съездила в Полоцк, побывала в келье святой. Меньше чем за два месяца образ был готов. Работаю я сутками, сплю очень мало, потому что дарованной господом жизнью должна распорядиться по его усмотрению. Работы свои не продаю, хотя жить совсем нелегко, да и материалы доставать надо. Но для храмов таких, как только что заложенная церковь «Всех скорбящих радосте», буду выполнять заказы.

Удивительно добрая энергетика исходит от ликов «Святой», «Николая Чудотворца» и остальных четырех образов. Именно она заставляет подолгу стоять в одном из залов музея, ощущая всей кожей какое-то тепло, а сердцем — необычный покой, который люди верующие называют благодатью. Возможно, через свои работы Тамара Богданова действительно передает нам тот свет в конце тоннеля?!

ЛИДИЯ ПЕРЕСЫПКИНА,
БЕЛИНФОРМ.

АД ПРЫСЯГІ Ў ЗАПАСЕ НЕ АДСЯДЗЕЦЦА

КААРДЫНАЦЫЙНАЯ рада Беларускага згуртавання вайскоўцаў выступіла з заявай, у якой звярнулася да Вярхоўнага Савета і ўрада рэспублікі з прапановай прывесці да прысягі народу Беларусі ўсіх вайскоўцаў запасу.

Аргументуючы неабходнасць гэтага, кіраўніцтва БЗВ адзначыла, што Узброеныя Сілы рэспублікі яшчэ не сталі сапраўды беларускімі. «Шмат каго з афіцэраў, — гаворыцца ў заяве, — больш хвалюе не лёс Беларусі, а тое, што ў Расіі больш плацяць. З войску выціскаюцца ўсімі магчымымі сродкамі афіцэры-патрыёты, захоўваецца дзіўная і непаразумелая сістэма кадравых прызначэнняў на вышэйшыя пасады не кіраўніцтвам Міністэрства абароны, а асобнымі чыноўнікамі Саўміна. Працягваюцца і набываюць масавы памер раскраданне дзяржаўнай маёмасці і злоўжыванні службовым становішчам, развальваецца сістэма баявой падрыхтоўкі. З гэтага бачна, што стан войску пакуль яшчэ не дазваляе ўспрымаць яго як надзейную абарону нашай зямлі, нашых сем'яў. Між тым на Беларусі жыве і працуе шмат патрыётаў сваёй краіны — вайскоўцаў запасу, якія ў выпадку пагрозы гатовы ўстаць на абарону Радзімы. Яны таксама хацелі б засведчыць сваю адданасць народу Беларусі.

ОШИБОЧКА ВЫШЛА. И ПОШЛА-ПОЛЕТЕЛА

НА ДНЯХ в редакциях размышляли над подаренной (с нашего государственного Олимпа) «сенсацией»: ББФ «Детям Чернобыля», оказывается, страшно вредная организация. Хапает из общенародного кошелька, спекулируя на людском горе, и живет припеваючи. Словом, размах и беспредел. Вывод? Да разогнать!

Одна из республиканских газет так примерно и написала. И, как выяснилось, напрасно. Потому что все сферы деятельности ББФ совсем недавно и предельно скрупулезно проверяла Контрольная палата РБ. И из официальных документов, подписанных ведущим контролером А.Е.Сопрановичем, явствует: из бюджета в фонд не поступало ни копейки, коммерческой деятельности (как и положено цивилизованной благотворительной организации) он не ведет, а вот 40 тысяч детей сумел отправить на оздоровительный отдых, более 200 — на лечение. «Грешен» также в том, что построил цех по производству экологически чистого детского питания, финансирует садик для детей с ДЦП, школу для детей, больных сахарным диабетом... Перечислять сделанное Фондом можно долго. Но — терпение — еще несколько цифр здесь уместно: Фонд заплатил налоги государству в сумме 1526,1 тысячи рублей (3,4 процента от всех израсходованных в 1992 году средств). На зарплату же (по всем многочисленным видам работ!) истрачено лишь 2,6 процента из кошелька самого же ББФ. Вот такая арифметика.

Из Дома правительства в Фонд сообщили: виноваты, мол. Ошибочка вышла. Ошибочка ли? Ведь именно Фонд «Детям Чернобыля» давно и неизменно вызывает раздражение у тех, кому не по душе его независимость, четкость в действиях, все растущий авторитет на Западе.

РИД.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

— Ты за парлямэнт ці за прэзідэнта?
— Я за тое, каб зноў пачалі сеяць кукурузу...

Малюнак Леаніда КАЛОДЗІНА.

МЕРКАВАННЕ

ЦІ ЎСЁ ТРЭБА РАЗБУРАЦЬ?

Алена ГРАХОЎСКАЯ.

Сённяшняя рэформа адукацыі адным з асноўных напрамкаў мяркуе гуманітарызацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу за кошт пашырэння пераліку прадметаў гуманітарнага цыкла і павелічэння гадзін іх вывучэння. Гэта, лічу, вельмі важна, бо гэтыя прадметы павышаюць культурны ўзровень спецыяліста, даюць навыкі працы з людзьмі, у калектыве, ды проста садзейнічаюць выхаванню адукаваных, інтэлігентных людзей, якія ведаюць сваю гісторыю і культуру, здольныя разбірацца ў палітычных і сацыяльных праблемах. Ва ўсім свеце даўно прызнана, што гуманітарныя і сацыяльныя дысцыпліны неабходны пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

У «барацьбе» з тэхнакратызмам нашай сучаснай адукацыі грамадазнаўцам прыходзіцца даволі складана. Доўга лічылася, што павінен выкладацца толькі марксізм-ленінізм. І цяпер, калі зацвердзіліся іншыя філасофскія плыні і школы, многім выкладчыкам, асабліва сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, вельмі цяжка зарыентавацца ў разнастайнасці пунктаў гледжання, што існуе ў сучасным грамадстве. Дый, пакуль што практычна няма ні падручнікаў, ні даведачна-інфармацыйнай літаратуры, ні метадычных распрацовак «новага пакалення».

Менавіта таму дзейнасць Беларускага нацыянальнага інстытута гуманітарных навук пры БДУ, якая арганізавана на высокім прафесійным і тэхнічным узроўні, на сённяшні дзень неацэнная. Гэта, бадай, адзіная ўстанова, дзе выкладчык сацыяльна-гуманітарных дысцыплін можа атрымаць дапамогу як у вучэбным, так і ў метадычным плане. Толькі за апошні год, напрыклад, больш паловы выкладчыкаў сярэдніх сельскагаспадарчых навучальных устаноў прайшлі перападрыхтоўку ў інстытуце.

Заняткі вядуцца цяпер і па новых для нашай адукацыі дысцыплінах: паліталогіі, сацыялогіі, гісторыі і тэорыі айчыннай і сусветнай культуры, гісторыі і тэорыі рэлігіі і вольнадумства.

Дарэчы, выкладчыкі інстытута вядуць заняткі не ў рамках якойсьці адной плыні, а даюць шэраг напрамкаў і пунктаў гледжання на тую ці іншую праблему.

Нацыянальны інстытут гуманітарных навук пакуль што, відаць, адзіная ўстанова ў рэспубліцы, якая займаецца распрацоўкай праграм для сярэдніх навучальных устаноў. Акрамя названых прадметаў былі распрацаваны праграмы па сацыяльнай псіхалогіі і асновах прававых ведаў Рэспублікі Беларусь (апошняя — з улікам змяненняў у заканадаўстве і новых падыходаў да правазнаўства).

Таксама супрацоўнікі інстытута падрыхтавалі метадычныя распрацоўкі па філасофіі, паліталогіі, эканамічнай тэорыі, гісторыі, культуралогіі, частка з якіх — на беларускай мове.

Апошнім часам ставіцца пад сумненне мэтазгоднасць існавання Беларускага нацыянальнага інстытута гуманітарных навук. Да того ж у такіх сур'ёзных дакументах, як Пастанова Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. Але, калі гэты інстытут ужо такі непатрэбны, куды яшчэ зможа звярнуцца за дапамогай, напрыклад, выкладчык сацыяльна-гуманітарных дысцыплін сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы? Можа да вас, паважаныя дэпутаты?



Малавядомы Мінск

17 ДВ

ПЕРШАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

ДА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ

А.САКОВІЧ.

У мінулым выпуску «Малавядомага Мінска» («ДВ» ад 6 мая г.г.) мы ўжо прадстаўлялі пісьменніцу Іну Рытар (псеўданім — Аляксандра Саковіч), якая жыве і займаецца літаратурнай справай у ЗША. Сёньня наступная яе публікацыя — па просьбе аўтаркі ўспаміны друкуюцца з захаваннем правапісу арыгінала.

Падаючы гэтыя кароткія зацемкі аб заснаваньні й першых гадох працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту (БДзУ) у Менску, лічу неабходным падчыркнуць, што БДзУ быў паклікан да жыцьця ў 1921 годзе ахвярнаю працаю беларускіх грамадзкіх працаўнікоў, а не бальшавіцкаю ўладаю, як гэта цяпер часта падаецца ў савецкім друку. Ідэя арганізацыі высокай навучальнай школы ў Беларусі мела свае глыбокія традыцыйныя карэньні, пра яе ўжо даўно думалі беларускія навукоўцы й над рэалізацыяй яе працавалі многія гады да дня закладзінаў БДзУ.

Кажнаму, хто цікавіўся пытаньнем вышэйшай школы ў Беларусі, ведама, што краіну вялікую абшарам і насельніцтвам, слаўную некалі, як цэнтр высака разьвітай культуры й мастацтва, расейскі ўрад пазбавіў вышэйшай школы амаль на цэлае стагодзьдзе. Ад 1832 аж да 1921 году Беларусь ня мела вышэйшых навучальных установаў. Праз увесь гэты час расейскі ўрад праводзіў сыстэматычную русыфікацыйную палітыку й, нязважаючы на неаднаразовыя захады, не даваў дазволу на адчыненьне вышэйшай школы. Расейскія ўлады разумелі добра, што вышэйшая школа ў Беларусі магла стаць асяродкам апазіцыйнага нацыянальна-палітычнага й культурнага руху. Беларусь-жа, пазбаўленая сваёй высокай школы, паступова ператваралася ў расейскую калёнію, заняпалую культурна й эканамічна.

Неабходнасьць сваёй вышэйшай школы, гэтай крыніцы веды й жывой творчай думкі, заўсёды добра разумелі дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэньня. З пачаткам рэвалюцыі 1917 г. беларускі нацыянальна-культурны й рэвалюцыйны рух набывае надзвычайную глыбіню й размах. [illegible]

[illegible] якіх грунтоўна абаснаваў неабходнасьць адчыненьня унівэрсытэту ў Беларусі. Гэты праект Народны Сакратар'ят БНР разгледзіў і паставіў:«...даручыць праф. М.Даўнар-Запольскаму, С.Някрашэвічу й Я.Лёсіку ў супрацы зь іншымі навукоўцамі падрыхтаваць усё патрэбнае да адчыненьня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту...» (каляндар «Сваяк», Вільня, 1919 г., бач. 18).

У абодвых праектах былі намечаныя гэткія факультэты: гістарычна-філёлягічны, юрыдычны, мэдыцынскі, фізыка-матэматычны й багаслоўскі. Апрача гэтага ў праекце праф. М.Даўнар-Запольскага быў прадбачаны й шосты факультэт — камэрсыйна-эканамічны. Праф. Даўнар-Запольскі зазначаў вялікую патрэбу й карысьць такога факультэту, падчыркваючы, што арганізацыя яго ня будзе вымагаць шмат асобных катэдраў.

Другі праект унівэрсытэцкага ж статуту ўклаў акадэмік Карскі ды надрукаваў яго ў менскай газэце «Вольная Беларусь». Хоць ніводзін з гэтых праектаў і ня ўдалося тады зьдзейсьніць, бо ўраду БНР прышлося хутка эміграваць, ідэя адчыненьня унівэрсытэту захоўвала сваю актуальнасьць сярод тых беларускіх дзеячоў, якія засталіся для грамадзкай працы ў Беларусі, засталіся для яе з усёй сьведамасьцяй, што новая акупацыйная ўлада нясе тую ж нацыянальную няволю, што й былая царская. У сваёй прамове з прычыны сьмерці А.Бурбіса ў 1922 г. Язэп Лёсік гэтую думку падчырквае выразна й бяз страху словамі:«Ты не дайшоў яшчэ да Абяцанае Зямлі, ня дойдзе яшчэ шмат хто з нас, бо ўсе мы ў няволі радзіліся й мусім памерці, як тое яўрэйства, што вадзіў Майсей па пустыні».

Шмат энэргіі й стараньняў трэба было пакласьці Усеваладу Ігнатоўскаму, Аляксандру Чарвякову, Язэпу Лёсіку, Сьцяпану Некрашэвічу й іншым, каб, пад няспынным бальшавіцкім кантролем і перашкодамі, ідэя адчыненьня беларускага унівэрсытэту ня была пахаваная й ператварылася ў запраўднасьць. 11 ліпеня 1921 г. быў зацьверджаны дэкрэт аб ад[illegible]

[illegible] эканамічна паваенны час, поўны нястачаў у выніку ваенных зьнішчэньняў, пры разбуранай цалкам гаспадарцы Беларусі. У зруйнаваным вайною Менску ня было нават і адпаведнага пад унівэрсытэт будынку. Не хапала й сродкаў для прыдбаньня адпаведнага навуковага аснашчэньня. Каб загарантаваць для нова-паўсталага унівэрсытэту належны прыплыў навуковых сілаў [illegible] было стварыць [illegible] коўцам гэткія ўмовы [illegible] гадзіліся на пер[illegible] працу ў Менск. [illegible] з прафэсароў-[illegible] баяліся ехаць [illegible] Менск, бо яны [illegible] рылі, што БДзУ [illegible] наагул доўга існ[illegible]

